# Сінонімы

**156.** Разгледзьце малюнкі. Якімі словамі можна падпісаць кожны з іх?








Школьніца, трэніруецца, вясёлы, вучаніца, практыкуецца, радасны.

Запішыце словы парамі. Якое значэнне маюць словы ў парах?

> Словы, якія маюць аднолькавае ці блізкае значэнне, называюцца **сінонімамі**.

**157.** Знайдзіце ў кожнай групе слоў лішняе. Назавіце прымету, якая аб’ядноўвае астатнія словы ў кожнай групе. Запішыце гэтыя словы.

1. Лес, бор, гай, дрэва, пушча.
2. Ісці, ступаць, стаяць, тупаць, крочыць.
3. Адважны, ціхі, смелы, мужны, храбры.

З двума словамі-сінонімамі прыдумайце і запішыце сказы.


Правообладатель Национальный институт образования

**158.** Прачытайце тэкст.

Віка весяліла сястрычку, гуляла з ёй у ладкі. Маленькую Волечку гэта вельмі весяліла. Мама з пяшчотай назірала за дачушкамі. Яе весяліла забава дзяцей.

Якое слова паўтараецца ў тэксце? Як пазбегнуць паўтораў? У словах для даведкі знайдзіце сінонімы да слова *весяліла*.

Словы для даведкі: *радавала, засмуча́ла, це́шыла, гаварыла*.

Замяніце ў тэксце слова *весяліла* сінонімамі, каб пазбегнуць паўтораў. Прачытайце выпраўлены тэкст.

**159.** Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Калі здолееш узяцца за справу — і снег **загарыцца**, не здолееш — і масла не **ўспыхне**.

Выпішыце выдзеленыя словы. Як яны называюцца? Знайдзіце ў прыказцы сінонім да слова *ўхапіцца*.

**160.** Прачытайце спалучэнні слоў. Замяніце выдзеленыя словы сінонімамі.

**Смелы** чалавек, сасновы **лес**, хутка **крочыць**, **гоман** лесу, сапраўдны **смяльчак**.

Запішыце спалучэнні слоў, якія атрымаліся. З адным з іх на выбар вусна складзіце сказ.



Правообладатель Национальный институт образования

**161.** Падбярыце да слоў з піраміды сінонімы, якія ўтрымліваюць тую ж колькасць літар.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | л | е | с | * | * | * | | | |
| | | г | о | р | а | * | * | * | * | | |
| | м | а | р | о | з | * | * | * | * | * | |
| д | р | ы | г | в | а́ | * | * | * | * | * | * |

**дрыгва́** — балота, ба́гна

Запішыце словы парамі. З адной парай слоў на выбар складзіце і запішыце сказы.

**162.** Спішыце. Знайдзіце ў вершы сінонімы і падкрэсліце іх.

Раптам гоман сціх,
і смех
змоўк у момант нейкі —
паваліў пушысты снег.
Аж казы́ча вейкі.

*У. Паўлаў.*

**казы́ча** — *рус.* щекочет

Выпішыце з верша блізкія па значэнні словы да прапанаваных.

Шум — ..., пасыпаў — ..., пухкі — ... .



Правообладатель Национальный институт образования